Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Палітвязня Арцёма Карачуна прызналі вінаватым і прысудзілі тры гады «хіміі»

09.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні



Арцем Карачун

Арцём Карачун **быў затрыманы 5 жніўня 2021 года.** Дома ў яго прайшоў ператрус. Пасля 10 сутак у ІЧУ на Акрэсціна яго перавялі ў СІЗА-1. Затрыманаму 1995 года нараджэння прад'явілі абвінавачванне па ч.1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса РБ – «Арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак».

Арцёма асудзілі за яго грамадзянскую пазіцыю. Яго пераслед, пазбаўленне волі і абвінавачванні праваабаронцы расцэньваюць як «палітычна матываваны пераслед у сувязі з рэалізацыяй свабод мірных сходаў і выказвання свайго меркавання з нагоды вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года».

**8 лістапада ў судзе Фрунзенскага раёна Мінска прайшоў суд. Арцёма прызналі вінаватым.** У якасці пакарання суддзя **Алёна Бушава** прысудзіла палітвязня да **абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на 3 гады.** Такую меру стрымання, па словах абвінаваўцы, «суд палічыў дастатковай для выпраўлення з улікам таго, што да крымінальнай адказнасці Арцём Карачун прыцягваецца ўпершыню і мае станоўчыя характарыстыкі».

На Арцёма «будуць накладзеныя абавязкі, якія абмяжоўваюць яго свабоду». Простымі словамі, сваё пакаранне ён будзе адбываць у папраўчай установе адкрытага тыпу, дзе будзе працаваць паводле вызначанага раскладу, вяртацца ў папраўчую ўстанову па раскладзе, бачыцца з роднымі ў строга дазволеныя дні.

Таксама суд пастанавіў, што «дзеянні падсуднага, яго відавочнае непадпарадкаванне законным патрабаванням прадстаўнікоў улады пацягнула за сабой парушэнне працы грамадскага транспарту, у выніку чаго «Мінсктранс» мае права падаць пазоў аб спагнанні з Арцёма Карачуна сумы прынесенай ім шкоды».

Грошы (50 рублёў і 10 еўра), сродкі з рахунку Арцёма ў «Белінвестбанку», тэлефон, два ноўтбукі, якія былі ў яго канфіскаваныя, суд пастанавіў пакінуць пад арыштам.

Самога палітвязня суддзя пастанавіла вызваліць з-пад варты ў зале суда, узяўшы з яго падпіску аб нявыездзе да моманту ўступлення прысуду ў сілу. Тэрмін адбыцця пад вартай з 5 жніўня да 8 кастрычніка суддзя пастанавіла залічыць у тэрмін адбыцця пакарання ў папраўчай установе адкрытага тыпу з разліку 1 дзень у СІЗА да двух дзён адбыцця пакарання ў папраўчай установе адкрытага тыпу.

Твитнуть





## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO




## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў










## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022









## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

